Першы пакліканы

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
21.11.2021 00:00



У літургіі Касцёла св. апостала Андрэя ўспамінаем 30 лістапада. Св. апостал Андрэй – чалавек веры і надзеі, які нават праз сваю смерць прывёў да Хрыста вялікія тлумы людзей. Св. Андрэй у многіх атаясамліваецца з “андрэйкамі” або са шматлікімі народнымі прыказкамі, звязанымі з яго імем. Між тым, у імені св. Андрэя ўтоена нашмат глыбейшае пасланне – пасланне веры, вынікам якой у нашым жыцці павінны стаць жывыя адносіны з Езусам Хрыстом. †

Андрэй быў чалавекам, які шукаў, які падзяляў надзеі Ізраіля, які хацеў зблізку пазнаць Божае слова. Ён быў сапраўды чалавекам веры і надзеі. Менавіта ён як вучань Яна Хрысціцеля адкрыў у сваім сэрцы, што Езус – Той, хто павінен быў прыйсці. Зразумеў, што Ён з’яўляецца Месіем, Баранкам Божым, на якога ўказаў Ян. “Яны пайшлі і ўбачылі, дзе Ён жыве, і засталіся ў Яго ў той дзень” (параўн. Ян 1, 39). Андрэй вельмі хутка стаў сапраўдным апосталам Хрыста. І хоць як першы пакліканы не адыгрываў пазней галоўнай ролі ў коле апосталаў, ад пачатку выдатна ведаў, што павінен весці іншых да Хрыста. Менавіта ён прывёў да Езуса свайго брата Сымона, а потым, падчас апостальскай місіі, – вялікія тлумы людзей.

Першы пакліканы

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
21.11.2021 00:00



Першы паклiканы

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
21.11.2021 00:00

[redacted]**авека з гус**